# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## *ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ*

**УДК 882.6**

# ТЭМА СНАБАЧАННЯЎ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, АБО СУЧАСНЫ ВАРЫЯНТ МЕТАФІЗІЧНАЙ ПАЭЗІІ

***канд. філал. навук, дац. Н.Б. ЛЫСОВА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Аналізуецца творчасць аднаго з сучасных літаратараў Ігара Бабкова ў сувязі з развіццём паэтыкі снабачанняў у беларускай літаратуры. Даецца некалькі класіфікацый ужывання сну ў літаратурных тэкстах. Сцвярджаецца наяўнасць у сучасным беларускім літаратурным працэсе метафізічнай паэзіі з шырокім ужываннем паэтыкі снабачання, застаюцца і класічныя сатырычныя (асветніцкія) выкладанні снабачання. Менавіта літаратары апошняга часу (ці новага пакалення) асабліва шырока выкарыстоўваюць паэтыку снабачанняў з-за схільнасці да фантастычнага ці віртуальнага аповеду. Літаратура ХХ стагоддзя пашырае прынцыпы выкарыстання паэтыкі сну: гэта не толькі сны рамантычныя, легендарныя, скіраваныя на захаванне міфалагічных, рэлігійных і гістарычных традыцый, гэта і алегарычныя, сатырычныя літаратурныя сны, скіраваныя на актуальнае сучаснае становішча.*

**Уводзіны.** Беларуская літаратура новага часу пачынаецца з аповеду пра сон палясоўшчыка Тараса. Паэма «Тарас на Парнасе» напісана ў святле Асветніцтва ці класічнай літаратурнай школы – перарobленага антычнага аповеду, у якім распавядаецца пра пір багоў на Алімпе, але ўбачаны вачыма мужыка. У выніку з'явіўся фарсавы, сатырычны вершаваны аповед.

Зварот да паэтыкі снабачання ўстойліва захоўваецца ў XIX стагоддзі ў творчасці А. Міцкевіча, А. Адынца, Я. Чачота, Т. Зана, Ф. Савіча, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча. Аб гэтым – дысертацыйнае даследаванне З.М. Тычыны «Паэтыка снабачанняў у літаратуры Беларусі XIX стагоддзя». Аўтар заўважае наяўнасць некалькіх тыпаў літаратурных сноў у беларускай літаратуры XIX стагоддзя: структурна цэласных (у тэксце яны будуюцца як асобная частка) і з парушанай структурнай цэласнасцю (з няпэўным пераходам ад явы да сну).

З. Тычына тлумачыць пашыранасць паэтыкі снабачанняў рамантычнай традыцыяй, з яе зваротам да народнай і рэлігійнай традыцыі як пошукаў «шляху ў іншасвет» згодна фальклорнай і хрысціянскай традыцыі. Як працягваецца традыцыя ўжывання паэтыкі снабачання ў літаратуры навейшага часу? Як трансфармуюцца, змяняюцца літаратурныя сны? На гэтыя пытанні мы паспрабуем адказаць у артыкуле.

**Асноўная частка.** У ХХ стагоддзі беларускія літаратары схільны шырока выкарыстоўваць паэтыку снабачанняў. Пачынаючы з класічнага твора беларускай літаратуры – «Сон на кургане» Я. Купалы, дзе захаваліся традыцыі рамантычнага аповеду пра іншае быццё (легендарнае, гістарычнае). Заўважым, што дзеянне сна пры гэтым скіравана ў мінулае і легендарнае (бытуе заўсёды).

Між тым сусветная класіка, ці традыцыя біблейскіх сноў, – гэта сны-прадбачанні, сны правідцаў Іосіфа, Данііла і інш. Нездарма Х.Л. Борхес, складаючы сваю кнігу снабачанняў, заўважае ў прадмове да яе аб наяўнасці менавіта такой традыцыі: «начиная с пророческих снов Востока до аллегорических и сатирических снов средневековья». Аднак Борхес падкрэслівае наяўнасць у сусветнай літаратары і іншага кшталту снабачанняў, што прыходзяць з вытокаў асабістай псіхікі, яе «фантазіі». Такімі ён бачыць літаратурныя фантазіі літаратараў ХХ стагоддзя, або «игровые сновидения Кэррола и Франца Кафки» [1, с. 6].

Борхес таксама выдзяляе два тыпы сноў, адсылаючы чытача да павер'я з «Энеіды» і «Адысеі»: ілжывыя (што прыходзяць праз «ворота из слоновой кости») і праўдзівыя («…через роговые ворота») – прароцкія. Пры гэтым даследчык заўважае аб паслядоўным пранікненні ў літаратурны аповед тэматыкі начных кашмараў, або «казак ночы», жудасных відовішчаў: «искусство ночное постепенно проникало в искусство дневное» [1, с. 7]. Яго цяжка класіфікаваць, таму што мяжа паміж яваю і сном тут не дакладна акрэслена.

У беларускай літаратуры «кабылы ночы» [1, с. 6] пачынаюцца са спробаў перадачы «плыні свядомасці». Гэты метад літаратурнага аповеду выкарыстоўваюць Ул. Караткевіч, В. Казько, А. Дудараў, А. Бахарэвіч і інш. Асобная старонка такога выкарыстання сну – раман Алеся Адамовіча «Карнікі» (пісаў-

ся ў 1980 – 1981 і 1987 – 1988 гг.), які пабудаваны на дакументальным матэрыяле, што пададзены ў стылістыцы «плыні свядосмасці» ці снабачанняў, нездарма і назву ў асобных варыянтах раман меў – «Сны тыранаў». У кожным раздзеле рамана свой персанаж, які перажывае (ва «ўнутраных маналогах») сваю патаемную гісторыю. Адсюль адны і тыя ж падзеі асэнсоўваюцца па-рознаму, вачамі паліцаяў, забітых, Гітлера і Сталіна. Натуральна спалучаецца дакументалізм з псіхалагізмам і філасафічнасцю. Раман «Карнікі» мае падзагаловак «Радасць нажа, або Жыццяпіс гіпербарэяў». Ён можа быць патлумачаны, як спроба адказаць на пытанне аб вытоках чалавечай дэградыцыі, прыроды фашызму і таталітарызму. Пісьменнік спрабуе раскрыць натуру і псіхалогію правадырства праз паказ патаемнага, асабістага ці «соннага».

У сучаснай беларускай літаратуры застаюцца і класічныя сатырычныя (асветніцкія) выкладанні снабачання. Такім бачыцца апавяданне Васіля Быкава «Бутэльчына, альбо Прэзідэнт на дрэве», герой якога становіцца падчас сну прэзідэнтам нейкай афрыканскай і вельмі недэмакратычнай краіны. Такім з'яўляецца і верш-памфлет Уладзімера Арлова «Мне прысніўся Хадановіч», дзе аўтар малюе іранічны вобраз новага паэта-постмадэрніста.

Дарэчы менавіта літаратары апошняга часу (ці новага пакалення) асабліва шырока выкарыстоўваюць паэтыку снабачанняў з-за схільнасці да фантастычнага ці віртуальнага аповеду. Напрыклад, фрэска «С-с-с-о-о-о-н-н-н» Барыса Пятровіча і трыпціх сноў з другой часткі фантастычнага аповеду «Горад за 101-м кіламетрам» Алеся Бычкоўскага.

Як бачым, літаратура XX стагоддзя пашырае прынцыпы выкарыстання паэтыкі сну: гэта не толькі сны рамантычныя, легендарныя, скіраваныя на захаванне міфалагічных, рэлігійных і гістарычных традыцый, гэта – і алегарычныя, сатырычныя літаратурныя сны, скіраваныя на актуальнае сучаснае становішча, і сны-фантомы, скіраваныя на адлюстраванне суб'ектыўнай псіхалагічнай рэальнасці, і «віртуальныя» сны, што схільны ствараць новую магічную рэальнасць.

Але ёсць яшчэ адна традыцыя выкладання снабачання ў беларускай літаратуры – метафізічная ці платонаўская, дзе праз паэтыку снабачання аўтар тлумачыць ці малюе свой светапогляд, вызначае сваё месца ў сусвеце. Традыцыя, што ў нашай літаратуры знікла ў дваццатыя гады разам з яе аўтарам У. Жылка з нагоды непрымальнасці яе прынцыпаў тагачаснай ідэалогіяй сацыялістычнага рэалізму, і якая адраджаецца ў сувязі з творчасцю А. Разанава і яго паслядоўнікаў, у сувязі з новым перыядам развіцця літаратуры, з прыходам новага пакалення беларускай літаратуры.

Сучасны пісьменнік, які паслядоўна ў сваёй творчасці выкарыстоўвае паэтыку снабачання як метафізічны аповед, гэта – Ігар Бабкоў. Філосаф. Кніжнік. Усходнік. Крытык. Паэт і празаік. Ужо першы яго паэтычны зборнік «Герой вайны за празрыстасьць» пранізаны міфалогіяй снабачання, аб чым пісала і яго крытыка. Напрыклад, А.М. Шылец у артыкуле «Міфалагічная сімволіка сну ў паэтычным зборніку І. Бабкова "Герой вайны за празрыстасьць"» [2] звязвае «паэтычныя сны» Бабкова з паняццем усходняй танаталогіі «бардо», згодна якой «у выключным стане бардо, у стане паміранне і "пасмерця" чалавеку даецца шанс вызваліцца, адарвацца ад кола сансары» [2, с. 196]. Паэт распрацоўвае ў першым зборніку «семантычнае поле сну як слепаты, няведання, духоўнай абмежаванасці чалавека ў недасканалым свеце людзей-прывідаў, якія толькі думаюць, што жывуць, а ў сапраўднасці спяць», «сон атаясамліваўся з духоўнай смерцю» [2, с. 196]. Пасля ў творчасці І. Бабкова з'явіўся раман «Адам Клакоцкі і яго цені». Першы постмадэрніцкі, інтэртэкстуальны раман, дзе сабраны тэксты рознай тэматыкі, структуры, дзе ёсць і рамка (эпіграфы, па-барочнаму доўгая назва, думкі на развітанне), і раман у рамане, і вершы, і лісты, і запісы. Аднак кампазіцыйным стрыжнем рамана з'яўляецца сон, дакладней Беларускі Архіў Сноў, які стаў справай жыцця галоўнага героя – Адама Клакоцкага, «зьбіральніка, сыстэматызатара і дасьледніка сноў» [3, с. 6], аўтара дысертацыі «Сон як аргумент у палеміцы з картэзіянствам» і «Усеагульнай энцыкляпэдыі сноў» [3, с. 8]. Да таго ж ужо ў эпіграфах узгадваюцца і «начныя мроі» Рэнэ Дэкарта і «сны лёгкадумных» Зьбігнева Гэрбэрта, і далей у тэкстах таксама прыводзяцца цытаты вядомых літаратурных сноў. Заўважым, што адразу напачатку рамана ўзнікае сімвалічнае тлумачэнне сну, якое, на наш погляд, з'яўляецца вельмі важным для разумення пазіцыі нацыянальнага літаратара: герой рамана «параўноўвае радзіму з прыгожым сном, які сьніцца герою», і ён выказвае «пажаданьне, каб гэты сон доўжыўся вечна, бо мы ня ведаем, дзе і ў якіх краявідах нам давядзецца прачнуцца» [3, с. 7]. Менавіта гэтая патрыятычная сімволіка працягнецца потым у кнізе эссэ І. Бабкова «Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньні ру(і)наў» [4]. Так, «каралеўства» ці «прыгожы сон», ці казачнасць, несапраўднасць, невытлумачальнасць, па вялікаму рахунку, нацыянальнага самаадчування, ідэнтыфікацыі. Трэба зазначыць, што класіфікацыя снабачанняў Клакоцкага больш фантазійная, чым папярэднія, але і ў ёй прысутнічае згадка і пра «калектыўны сон» [3, с. 12], які зашыфраваны ў фальклоры, і пра «логацэнтрычны сон пра магуту» [3, с. 15], і пра славуты сон Чжуан Чжоў [3, с. 22], які прачнуўшыся, ніяк не мог уцяміць, хто ён, матылёк ці чалавек, і пра вядомую, «доўгую культурную традыцыю» асэнсавання жыцця як сну (пры гэтым аўтар дадае: «дык сон, напэўна, таксама жыццё») [3, с. 23].

Апошняя тэза аўтара мае ў рамане больш высноваў, гэта і ёсць паэтычная платформа аўтара, яго свет, штучны, але самы сапраўдны:

«Вечар Літвы: нібы кулі
Ноч рассыпала зоркі
Зьверы на ўсіх шляхох: што нам
Застаецца?
Сны
Ды магія словаў, што забылі прачнуцца».

«Ліст Адаму Міцкевічу пра сьмерць Літвы, напісаны Адамам Клакоцкім у Ліпнішках па дарозе на Вільню» [3, с. 95].

Сон як паэтычная прастора, як паэтычны стан – менавіта гэты напрамак паэтыкі снабачанняў абірае Ігар Бабкоў у сваёй апошняй кнізе вершаў. Асацыяцыі з класічнымі тэмамі сну пачынаюцца ўжо ў назве апошняга зборніка – «Засынаць, прачынацца, слухаць галасы рыб», што выклікае на памяць шэкспіраўскае «заснуць і бачыць сны». У гэтай традыцыі сон – і жыццё, і смерць. Апошнія вызначэнні сну прысутнічаюць як сінонімы і амонімы, так, як і ў паўднёваамерыканскага пісьменніка Элісеа Діаса ў яго навэле «Умереть, уснуть и видеть сны, быть может», дзе аповед пра прыгожы сон чалавека заканчваецца фразай аб тым, што ўжо некалькі хвілін гэты чалавек (той, хто сніць) быў нежывы [1, с. 255].

Аднак, на нашу думку, у апошнім зборніку І. Бабкова яскрава вызначылася іншая танальнасць – сузіральная, усходняя, часова-прасторавая. У паэзіі прысутнічае той паэтычны настрой, які выклікае югэн (катэгорыя ўсходняй паэтыкі, якую можна вызначыць як замацаванне смутку-радасці ад перажытага). На гэта паказвае і аўтар, калі гаворыць «… хіба словы нешта значаць/ Калі жыцьцё толькі сон і варта нарэшце прачнуцца/ Разам зь імі/ У краіне Чыстай Зямлі» [5, с. 17], адсылаючы нас да будысцкай філасофіі чыстай Зямлі. У Бабкова ёсць непасрэдна верш, прысвечаны гэтай эстэтычнай катэгорыі ўсходняга дзэн-будысцкага мастацтва – «Углядаючыся ў югэн прамінулага часу» [5, с. 22], у якім аўтар малюе пачуццё смутку-радасці пра мінулыя сустрэчы, яднанні, размовы «на самым скраі часу» – «Засталіся: яго нататнікі, яе сны, каляндар/ Два шалікі, зялёная лямпа, яе завушніцы/ Шклянка гарбаты, узьлёт веяў, самота ў Cafe/ І боль у сьпіне, крыху вышэй за сэрца» [5, с. 22]. Сярод прысвячэнняў і назваў з’яўляюцца ўсходнія імёны, як маякі, узоры паэзіі. Напрыклад, славуты Лі Бо – «П’яны і сьветлы, ён прыходзіць у сны/ Да забытых паэтаў, прамінулага часу/ Штосьці абяцае, чамусьці вучыць» [5, с. 24].

Верш «Вызваляючы мейсца таму, што ня мае імя…», з якога пачынаецца зборнік, на наш погляд, вызначальны, праграмны для разумення аўтарскай паэтыкі снабачання. Паэт слухае «сны акіяну», сусветнага, першароднага, ён робіць відушчым «сьляпога соннага Бога» [5, с. 3]. Гэты сон – бязмерная прастора пачуццяў, вопыту – «доўжыцца сон берагоў/ ня ведае дна акіян» [5, с. 14].

Пасля гэтага зборніку крытыка ўжо не можа абмяжоўваць успрыняцце паэтычнага снабачання Бабкова толькі матывамі смерці. Таму што яго сон па-над смерцю і жыццём. У яго іншыя характарыстыкі. Ён – «асалода» [5, с. 24], бо ў ім можна сустрэць Лі Бо, ці сяброў, ці Яе: «у сьне / Твае вусны зноў шукалі мяне» [5, с. 7], «ноч адпусьціла памяць» [5, с. 8].

Сон – фундамент творчасці, мыслення: «Нерасчытаная сутра… пра пераходы/ Ветру і цішы/ Жыцьця і руінаў/ Сну й чуйнаваньня» [5, с. 15].

Сон дапамагае існаваць аўтару ў гэты час, тут, на Беларусі. Паэзія – тая прастора, «на мяжы сну і явы» [5, с. 12], што дазваляе прымірыцца з рэальнасцю, бо «за фіранкамі сноў непрытомная, пустая эпоха…» [5, с. 9], «гэтыя руіны/ праплываюць праз нас, як праз веі сон» [5, с. 11].

Кніга падзелена на чатыры раздзелы, якія прысвечаны ідэалагічнай, пачуццёвай, творчай тэматыкам. Назва першага раздзела сугучна назве зборніка («Засынаць, прачынацца, слухаць галасы рыб»). У ім сабраныя тэмы, матывы, асацыяцыі наступных раздзелаў. Аўтар быццам гаворыць, што ён абраны запісваць свае «сны-вобразы» аб часе, аб сваіх і чужых гарадах, аб творцах і пачуццях, аб асалодзе і смутку, аб каханні і памяці. Фонам, ці інтэр’ерам, лірычнага «сну-аповеду» абрана восень і ноч (вершы «Ноч прыўзняла веі…», «За фіранкамі сноў», «скажы тыя словы…», «Нерасчытаная сутра», «Чатыры вершы Ван Вэю», «Чаму старадаўнія паэты…», «Восеньскі танец дэрвіша»). Пры гэтым Бабкоў не адракаецца ад выказанай у папярэдніх зборніках пазіцыі апазіцыйнага стаўлення да сучаснай масавай культуры (вершы «За фіранкамі сноў…», «падаючы ўглыб…», «Пакуль ты карміў гановэрскіх птушак…»). Непарушнай застаецца і вера паэта ў прастору духоўнасці ці сапраўднага існавання чалавека, «самотная вера» [5, с. 11] (вершы «Сьветлавокія барбары ня ведаюць…», «Нерасчытаная сутра», «Чаму старадаўнія паэты…», «Восеньскі танец дэрвіша» і інш.), замешаная на ідэалізаваных светапоглядах «Плятона, Ісуса, Лао Цзы» [5, с. 13] і «старадаўніх паэтаў» [5, с. 20] ды скіраваная да самааналізу і пошуку.

Другі раздзел «Прамінаць, лётаць, захутвацца ў аблокі» новай кнігі І. Бабкова пачынаецца «Сэйнамі. Кароткатэрміновай нірванай двух дэрвішаў па дарозе на гару Вуданг» [5, с. 31]. Аўтар прысвячае верш сучаснаму паэту Андрэю Хадановічу і малюе карціну «летняга» творчага трызнення, мар, дзеяння… ў вобразным алегарычным сюжэце аб тым, як «два дэрвішы імкнуцца ўзнавіць раўнавагу у Паўночнай Сарматыі» [5, с. 20]. Творы раздзела распавядаюць аб высновах творчасці – аб пачуццях, аб закаханасці паэта ў адухоўлены космас з яго кругазваротам жыцця, зімова-белага і восеньскі-жоўтага колеру («Па-за вокнамі доджд», «Звар'яцелая восень…», «Калі за халодным сутоньнем зімовага сну…» і інш.), аб суіснавання паэта разам з прыгажосцю смяротнай вечнасці, краявідаў далёкіх краін, гарадоў, мінулага (вершы «Вільня», «Восень у Парыжы…», «Лёндан») і жаночай прывабнасцю, пяшчотаю, таямніцаю («Тваіх валос цёмныя вадаспады…», «Твае вочы…», «Такая спакуса…», «Як птушку…», «Твае салодкія вусны…», «Мела ўладу загадваць…» і інш.).

Тэматыка трэцяга раздзела відавочна ўжо ў назве «Месца паэзіі». Паэт вызначае месца сваёй творчасці ў часе, у грамадстве і ў жыцці асобнага чалавека, у стылістычных варунках. Аўтар фармулюе свае разуменне сутнасці паэзіі як «канцэнтрацыі й ўзвышэньня духу» [5, с. 73] з дапамогаю слова. Бабкоў акцэнтуе ўвагу чытача на вербальнай прасторы паэзіі, на такіх яе вызначэннях, як «магчымасьці мовы, яе калідоры, яе краявіды» [5, с. 75] «паляваньне на словы» [5, с. 76], «спроба … даць мове шанец» [5, с. 77] і інш. Сутнасць такой скіраванасці яшчэ больш выразней адчуваецца тады, калі ведаеш, што размова ідзе аб «простай» мове з няпростым лёсам – аб беларускай мове. Напэўна, нездарма гэты раздзел напісаны вольнымі вершамі, «вершамі ў прозе», каб чытаць не скіроўваў увагу на гучанне, алітэрацыі, рыфмы, каб сутнасць ці вызначэнне паэзіі аўтарам гучала выразней.

Чацвёрты раздзел «Жыццё словаў: эпіфаніі» тэматычна падсумоўвае папярэднія паэтычныя размовы. Стылістычна ён адрозніваецца ад папярэдніх, аб чым гаворыць жанравая характарыстыка ў назве. У ім быццам ставяцца кропкі над «і», падводзяцца вынікі паэтычнага словавызначэння свету ў яго галоўных паняццях – мысьленьні, героях, мудрых, Радзіме, літаратуры, чытачах, ведах, прагрэсу і інш. (суадносна – назвы вершаў). Апошні раздзел кнігі быццам падсумоўвае папярэднія думкі ў кароткім жанры. Накшталт: «…праз жыцьцё трэба праплываць лёгка, нібы праз сон. …Сьніць яго, як быццам бы гэта быў сон анёлаў» («Сон анёлаў» [5, с. 86]. Тут аўтар размаўляе з героямі сваіх папярэдніх твораў і сусветнай культуры (вершы «Эйдасы», «Ляйбніц, Бог і Акудовіч», «Што гэта было?», «Неба» і інш.). Дакладней, фармулюе сваю паэтычную пазіцыю, адказвае часу і культуры на вечныя пытанні. Напрыклад, на такое цяжкае для сучаснага літаратара пытанне аб зваротнай сувязі з чытачамі, паэт рашуча адказвае: «Нават адзін чытач – гэта замнога» («Чытачы» [5, с. 112]). А дыскусію аб нацыянальнай ідэнтычнасці Адама Міцкевіча паэтычна і канчаткова падсумоўвае такім чынам: «У нас зь Міцкевічам ня толькі агульная зямля, але – і гэта больш істотна – агульнае неба» («Неба» [5, с. 104]).

І ўсё ж кніга чытаецца як адзіны тэкст, складзены з «аскепкаў сноў» [5, с. 12] паэта. Перад намі мазаіка свету, у якім існуе аўтар, літаратар. Пра апошняе сведчаць і кніжныя, культурныя асацыяцыі, і імёны сяброў, калег. У вершы, прысвечаным А. Разанаву, чытаем: «На мяжу сну і явы/ да гановэрскіх птушак, на самы скрай сьвету/ бо мы цені чужых сноў, Алесю, несьмяротныя цені/ разам з Эўрыдыкай заблукалі сярод жывых…» [5, с. 13]. І праз дзесяць старонак аўтар зноў вяртаецца да міфалагічнага вобраза, дапаўняе сімволіку міфа іншымі знаёмымі вобразамі: «Сьветлыя сны Эўрыдыкі, салодкія вусны Гэлены» [5, с. 21].

Паэзія Бабкова не выкарыстоўвае паэтыку снабачання, яна можа існаваць толькі ў сне. Паэзія і Сон – адзінае. Паэту наканавана «Зьбіраць каля аблокаў/ Сны» [5, с. 25], нават калі вакол «неспячыя», рэальнае і прагматычнае жыццё, паэт застаецца «дэрвішам» (адзін з вобразаў кнігі) ці суфійцам, бедным філосафам, што жыве музыкай нябёсаў і пачуццяў: «Калі музыка згубы падступіць пад сон/…На самым скраі: самоты, адчаю, сну/ На самым скраі: сярод аблокаў / Слодыч віна, смага, тонкія вусны/ танец апалай лістоты» [5, с. 27].

Да асаблівасцяў стылістыкі кнігі можна аднесці і яе меладычнасць ці «гучанне», якая дасягаецца такімі прыёмамі, як паўторы, алітэрацыі. Напрыклад, Бабкоў часта выкарыстоўвае пералічэнне дзеясловаў ці назоўнікаў у адной форме, з аднымі і тымі ж канчаткамі: «сіверны вецер/ **Б'е** ў бубны, **сьпявае, с**іпіць немым **сь**вістам» [5, с. 9], «знакі даўно памерлых/ Аніяк не могу**ць** раста**ць**…, /…узьлята**юць**…, /…ільну**ць**…,/…спакуша**юць**, /пада**юць**, падыма**юцц**а, імкнуцца бы**ць** разам» [5, с. 10], «мы... заблукалі сярод жывых/ сьпявае**м**, плача**м**, дакранае**мся** да аблокаў» [5, с. 13], «ён блук**ае** па небе/ Кід**ае** маланкі, гул**яе** с аблокамі, запальв**ае** ліхтары/ Мудрасьці. Слух**ае** галасы рыб/ Сьпяв**ае**, таньчыць, разьвінв**ае**/ Восені косы…. Чак**ае**…прыходзіць у **с**ны…, што**сь**ці абяц**ае**, чаму**сь**ці вучыць» [5, с. 24], «гэтыя **р**уіны… **р**эчы, жужул**кі**, палімсэсты **–** квет**кі**…, …гэтыя засохлыя датыкнень**ні**, шурпатыя эпіфа**ніі**, цёмн**ае** шчасце скамянел**ае** сьвятло безнадзейн**ае** трываньне» [5, с. 11]. Кожная страфа верша «Вера паэта…» [5, с. 65], будуецца як паўтор літары «в», з якой пачынаюцца вызначальныя для аўтара дзеясловы: верыць, вучыць,

ведаць. У гэтым стылістычным прыёме твораў кнігі адлюстраваны «паўторы» вобразаў сноў, «надакучлівасць» праблемных тэм дня. Але за паэтычнай формай і абагульненне дзённых сюжэтаў ва універсальным вобразным адлюстраванні.

**Вынікі.** У сучаснай беларускай літаратуры трывала ўсталёўваецца метафізічная ці платонаўская традыцыя паэтычнага аповеду, дзе праз паэтыку міфалагізацыі аўтары тлумачаць светапогляд, вызначаюць месца чалавека і творчасці ў сусвеце. Гэтая традыцыя выразна адлюстравана ў творчасці Ігара Бабкова, які паслядоўна выводзіць праз паэтыку снабачання тэматыку і стылістыку айчыннай літаратуры з даляглядаў нацыянальнай культуры і гісторыі ў шырокі кантэкст сусветнай мастацкай і філасофскай спадчыны.

ЛІТАРАТУРА

1. Книга сновидений / сост. Х.Л. Борхес. – СПб.: Амфора, 2005. – 303 с.
2. Шылец, А.М. «Міфалагічная сімволіка сну ў паэтычным зборніку І. Бабкова “Герой вайны за празрыстасьць”» / А.М. Шылец // Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі: матэр. Міжнар. навук. канф., Мінск, 20 – 21 лістап. 2003 г.; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка. – Мінск, 2004. – С. 195 – 197.
3. Бабкоў, І.М. Адам Клакоцкі і яго цені. Раман у дзесяці гісторыях / І.М. Бабкоў. – Менск: «БАС», 2001. – 110 с.
4. Бабкоў, І.М. Каралеўства Беларусь. Вытлумачэньне ру[і]наў / І.М. Бабкоў. – Мінск: Логвінаў, 2005. – 142 с. (Галерэя «Б»).
5. Бабкоў, І.М. Засынаць, прачынацца, слухаць галасы рыб: вершы / І.М. Бабкоў. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009. – 118 с. (Галерэя «Б»).

*Пастуніў 24.09.2009*

**DREAM THEME IN BELARUSIAN LITERATURE,**
**OR A MODERN VARIANT OF METAPHYSIC POETRY**

*The creative writing of one of contemporary writers Igor Bobkov is analyzed with a view to the poetics of dreams in Belarusian literature. Several classifications of usage of dreams in literary texts are given. The presence of metaphysical poetry with a broad application of the poetics of dreams in Belarusian literary process is asserted.*